**М. С. Рагачэўская**

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ МАЛОЙ ПРОЗЫ XXI СТАГОДДЗЯ В. БЫКАВА

Творчасць знакамітага беларускага пісьменніка, мастака слова і ўвасобленага сумлення сваёй нацыі Васіля Уладзіміравіча Быкава (1924–2003) адзначана вялікай колькасцю літаратурных прэмій, сярод якіх Ленінская прэмія 1986 г., Дзяржаўная прэмія СССР 1974 г. і Дзяржаўная прэмія БССР 1978 г., міжнародная расійская незалежная прэмія "Трыумф" 2000 года. Акрамя таго, Васіль Быкаў з'яўляўся намінантам на Нобелеўскую прэмію 1996 года. Усё гэта сведчыць аб прызнанні і значнасці яго творчага ўнёску, адметнай рысай якога была глыбокая псіхалагічная распрацоўка тэмы чалавека на вайне. Разгляд гэтага і іншых аспектаў мастакай карціны свету В. Быкава рознабакова і даволі пашырана прадстаўлены ў літаратуразнаўчых працах беларускіх навукоўцаў. Проза пісьменніка прызнана адметнай, маючай яскравы, магутны індывідуальны мастацкі стыль.

Як гэта адбываецца з мастацкай эвалюцыяй на працягу жыцця абсалютна кожнай творчай асобы, асабліва пісьменніка, заўсёды можна вылучыць нейкі ранні перыяд, які звычайна намячае нейкі почырк, індывідуальнасць, закладвае асновы светапогляду; сталы перыяд, які робіць аўтара пазнавальным, надзяляе яго ідывідуальнасць трывалымі характарыстыкамі, адточвае і замацоўвае яго імя сярод нейкай плеяды, узнікшай у канкрэтным гісторыка-культурным асяроддзі; і, нарэшце – апошні, завяршальны перыяд творчасці, які часцей за ўсё вызначаецца філасафізмам, ураўнаважаннем радыкальнага светапогляду, часта – расчараваннем у соцыуме ці чалавеку, фінальнымі акордамі таго пасылу, які пакідае пісьменнік нашчадкам у якасці праверанага часам досведу, каштоўнай парады. Так было з У. Шэкспірам, які на апошнім этапе творчасці "прымірыў" трагічнае і камічнае ў сваім мастацкім сусвеце, пачаў гаварыць пра дараванне замест помсты, праявіў філасофка-дыялектычны погляд на праблемы чалавека. Ч. Дзікенс, у сваю чаргу, прыйшоў да пэўнага экзістэнцыйнага песімізму, таму што не знайшоў рашэння праблемы эксплуатацыі чалавека чалавекам, праблемы дамінавання маральна скалечаных над светлымі і ўзнёслымі. М. Твэн хоць і не адмовіўся ад свайго гумарыстычнага погляду на грамадства, але ў апошніх творах таксама падвёў вынікі, і скрозь яго гумар прасочваюцца філасофскія ноткі ўраўнаважанага аналізу чалавека як божага стварэння ("Дзённікі Адама і Евы").

Гэтыя і шматлікія іншыя прыклады мастацкай эвалюцыі пісьменнікаў сведчаць аб тэндэнцыі філасафізму, дакладней, інтэлектуалізацыі творчага мыслення. Б. М. Праскурнін наступным чынам вызначае праявы інтэлектуалізацыі прозы: гэта такі аповед, "дзе пераважае ўвага да розуму і яго фарміравання і функцыянавання як працэса спазнання жыцця героем (гераіняй) і спазнання ім (ёю) самога (самой) сябе, калі дамінуе «сутычка ідэй», сам працэс мыслення становіцца «каркасам», на які «накладваецца» сюжэт…".

Што датычыцца прозы В. Быкава ў кароткі завяршальны перыяд яго творчага і фізічнага жыцця (1990-я і пачатах 2000-х гг.), то яе мы таксама можам ахарактарызаваць як “філасафічную”, “інтэлектуалізаваную” па наступных прычынах. Перш за ўсё, гэта мемуарная проза, якая, як вядома, заўсёды вызначаецца большай ступенню абагульнення і пераасэнсавання асабістага жыцця (“Доўгая дарога дадому”, “Парадоксы жыцьця. Запісы розных гадоў”, “Пункціры жыцьця. Далітаратурная біяграфія” – гэтыя творы ўвайшлі ў асобную кнігу “Доўгая дарога дадому: Кніга ўспамінаў”). Акрамя мемуарнай прозы, В. Быкаў напачатку XXI ст. стварыў і некалькі апавяданняў, і метавіта ў іх можна разгледзець яскравыя рысы інтэлектуалізацыі пісьменніцкага стылю, таму што ў іх выразна адчуваюцца экзістэнцыяльныя матывы, высокая ступень абагульнення хранатопу і тыпізацыі героя.

У 2003 г. выйшла сумесная кніга В. Быкава і Р. Барадуліна “Калі рукаюцца душы”. У яе склад, гаворачы пра ўнёсак В. Быкава, увайшлі некалькі новых (“Байкі жыцця”, “Абязбожаны люд” і “ Хутаранцы”) і раней ім створаных апавяданняў. Аднак той факт, што пісьменнік вырашыў аднавіць тэкст свайго апошняга творчага перыяду, дае нам пэўнае права лічыць гэтыя творы знакавымі для пачатку новага тысячагоддзя. Разделы прозы ў аўтарстве Быкава ў складзе кнігі прызнаюцца даследчыкамі філасофскімі прыпавесцямі.

А. Макмілін трапна адзначае, што творы, “новыя, надрукаваныя ўпершыню ў зборніку «Калі рукаюцца душы», вытрыманыя ў тым жа самым глыбока песімістычным тоне”. Гэта ў тым ліку “Насарогі ідуць”, “Вязніца траўм”, “Чарапы”, “Гонар і смерць”, “Другая альтэрнатыва”, “Вежа”, “Ідэя” і інш. Найбольш яскравымі прыкладамі інтэлектуалізацыі з’яўляюцца дзве першыя названыя прыпавесці. Макмілін піша: “Прыпавесці Быкава надзвычай актывізуюць думкі, яны лаканічныя і ў той жа час ненавязліва элегантныя, маркотныя, але ні ў якім разе не сентыментальныя, гэта збор яго апошніх думак пра радзіму”.

У прыпавесці-мініяцюры “Насарогі ідуць” распавядаецца пра тое, як нейкае племя, падобнае па апісанні на першабытнае, моцна пакутуе праз прыгнёт магутных людзей-насарогаў, якіх ніхто яшчэ не перамог, і ад якіх магчыма толькі адкупіцца, што ўвесь час і рабілі бедныя людзі племя, пакуль не аддалі ўсё, а апетыты рабаўнікоў і забойцаў пашырыліся на прыгожых жанчын племя. Памылкова лічачы, што, аддаўшы лютым насарогам сваю сястру і жонку, ён забяспечыў племю мірнае жыццё, правадыр у выніку разумее, што страціць усіх жанчын, таму што насарогі не маюць ні гонару, ні сумлення, ні праўды. Яны гатовыя забіць усіх. І тады племя пад правадырствам Ко вырашае стаяць насмерць. І атрымлівае перамогу, хоць і цаной стратаў, у тым ліку і самаго Ко. “Дзякуй, Зорка Вайны! За дапамогу тым, хто страціў надзею...” – кажа новы правадыр, што ўвесь час не згаджаўся з рашэннямі Ко. “Яго ніхто не абіраў, не прызначаў правадыром. Ды ён і не пытаўся ні ў кога. Ён ужо ведаў, як трэба ставіцца да насарогаў...”. Відавочны алегарызм, суаднесены з рэаліямі існавання дзяржаў у XX ст. і захопніцкімі войнамі. В. Быкаў адмаўляецца тут ад наратыву развагі, псіхалагізму,

унутранага маналогу і цалкам звяртаецца да лаканізму, хуткай змены эпізодаў, канстатацыі факту. Такім чынам нібыта “агаляецца” галоўная інтэлектуальная дылема, якая носіць характар палітычнага рашэння. Былыя сутыкненні ідэй, што вызначалі спелую прозу пісьменніка, у дадзеным выпадку нібыта знаходзяць прымірэнне. Імператыў барацьбы за праўду застаўся ў сістэме каштоўнасцяў, аднак выразна гучаць і ноткі “цаны” ўсялякай перамогі.

У “Вязніцы траўм” перад чытачом паўстаюць вязні. Яны апантаныя жаданнем свабоды і таму аб’яўляюць галадоўку ў сваім засценку. А па-за сценамі турмы таксама ідзе барацьба супраць прыгёту. І калі вязні нарэшце рэшт апынаюцца на свабодзе, яны сутыкаюцца з холадам і голадам. З гэтага вынікае самая знакавая экзістэнцыйная сітуацыя: або чалавек выбірае галодную і халодную свабоду, або турму, дзе даюць сховішча ад непагадзі і ежу. Апошняе і выбіраюць некаторыя з былых вязняў. Паўстанне звонку падаўлена, яго завадатар павешаны. Песімістычная і адначасова даволі рэалістычная канцоўка пакідае перад чытачом толькі праблему выбару, не паказваючы пераваг, не намякаючы на аўтарскія прыхільнасці ці перакананні. У дадатак ніякай канкрэтыкі, дакладнасці хранатопу ў прыпавесці няма. Менавіта такая рыса і вызначае алегарызм і запрашае да выпрацоўкі абагульненняў.

Асобным творам XXI ст. з’яўляецца таксама і аповесць “Балота”, напісаная ў лютым 2001 г., якую даследчыкі называюць “традыцыйна-быкаўскай”, таму што яна зноў вяртаецца да матыву захавання чалавечнасці ў нечалавечых умовах вайны. Гэты аповед, як і “Насарогі ідуць”, таксама і пра цану чалавечага жыцця: той, хто выканаў вайсковае заданне, але можа патэнцыйна быць перашкодай для ваенных стратэгій, аказваецца проста інструментам, што палягае знішчэнню. Але і тут Быкаў выкарыстоўвае экзістэнцыяльны матыў выбару, звязваючы яго годнасць з вартаснасцю чалавечай натуры.

Такім чынам, выявамі інтэлектуалізацыі прозы В. Быкава XXI ст. з’яўляюцца наступныя: мемуарны характар з акцэнтам на спасціжэнні жыцця ў выніку ранейшай сутычкі ідэй, экзістэнцыйная тэматыка, звязаная з праблемай цяжкага выбару, часта песімістычны пафас (асабіста канцоўкі), які адлюстроўвае светаўспрыняцце пісьменніка на прыканцы жыццёвага шляху, алегарычнасць хранатопу і філасофска-анталагічны характар вылучанай праблематыкі, скіраванасць да абагульненняў.